# Сакральнае ў паўсядзённым

## *Філасофская практыка прысутнасці ад Сяргея Міхалюка*

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрашае на персанальную фотавыстаўку Сяргея Міхалюка «Рыс і вобразы В'етнама: Сакральнае». Праект адкрывае перад гледачом унікальны свет, дзе фатаграфія перастае быць інструментам фіксацыі і ператвараецца ў сродак прысутнасці, перажывання і глыбокага асэнсавання жыцця. Філасофскі аўтарскі падыход да паўсядзённых рэчаў вучыць прыслухоўвацца да цішыні, глядзець не вачамі, а сэрцам.**



На працягу пяці гадоў аўтар назіраў за жыццём сельскіх абшчын паўночнага В'етнама, паглыбляючыся ў іх паўсядзённыя рытмы і цыклы. Сабраны візуальны матэрыял адлюстроўвае непасрэдную прысутнасць даследчыка ў асяроддзі, дзе чалавек не аддзяляецца ад прыроднага і культурнага кантэксту. Рыс тут не проста сельскагаспадарчая культура – гэта аснова жыцця, носьбіт памяці, сімвал калектыўнага досведу, праз які праяўляюцца гісторыя і сувязь пакаленняў.



Праект пабудаваны вакол трох ключавых катэгорый: рыс, рытуал і людзі. Рыс выступае матэрыяльнай і сімвалічнай асновай, праз якую можна адсочваць важныя жыццёвыя цыклы. Рытуал фарміруецца ў паўсядзённых справах, што ператварае звычайную працу ў сакральную дзею і асаблівую цялесную харэаграфію. Людзі – носьбіты досведу, якія звязваюць усе элементы жыццёвага цыкла. Праз іх прысутнасць і ўзаемадзеянне раскрываецца глыбіня культуры і дух месца.

Важнай у праекце лічыцца ўвага да цела. Жэсты, нахілы, судакрананне з вадой і глебай ствараюць непаўторны танец, дзе кожны рух прадыктаваны тысячагадовай гісторыяй узаемадзеяння са стыхіямі, перадае калектыўны досвед і ператвараецца ў сакральны рытуал. Цела становіцца пасрэднікам паміж унутраным і знешнім, правадніком вопыту і духоўнасці абшчыны. Серыя фотаздымкаў аўтара нагадвае своеасаблівы пластычны перформанс, праз які глядач адчувае неразрыўную сувязь чалавека з зямлёй, што яго корміць.

У праекце асаблівую ролю іграе час. Ён не лінейны і не вымяраецца звыклымі гадзінамі, а адчуваецца як цыкл: рост, выспяванне, збор ураджаю, паўтор дзеянняў, якія ніколі не бываюць ідэнтычнымі. Манахромная палітра ўзмацняе ўспрыманне і пераводзіць увагу ў тонкую эмацыянальную плоскасць. Святло і цемра становяцца носьбітамі сэнсу, робячы акцэнт на структуры вобраза, шчыльнасці прасторы і рытме падзей. Фатаграфія становіцца перажываннем, паглыбленнем у прастору, дзе знікае дыстанцыя паміж гледачом і аб'ектам здымкі. Аўтар фіксуе крохкасць традыцыйнага свету: фізічная праца, рытуалы і старажытныя практыкі паступова замяняюцца сучаснымі тэхналагічнымі і эканамічнымі працэсамі. Аднак фатограф не ідэалізуе мінулае. Ён проста захоўвае стан, асаблівы спосаб быцця і вопыт, які можна адчуць і перажыць.

«Рыс і вобразы В'етнама: Сакральнае» вучыць запавольвацца, прыслухоўвацца да цела, дыхання і руху, адчуваць рытм жыцця і цыклы прыроды, якія дапамагаюць знайсці сакральнае ў паўсядзённай рэальнасці. Гэты праект – філасофская практыка прысутнасці, запрашэнне да медытацыі праз візуальны вобраз. Сяргей Міхалюк не імкнецца паказаць В'етнам такім, які ён ёсць «насамрэч». Творца запрашае гледача перажыць асабісты досвед сустрэчы з сакральным, якое не патрабуе храмаў і рытуальных тэкстаў – яно хаваецца ў цёплым судакрананні з зямлёй, у першых усходах, у цішыні паміж ударамі сэрца. Праект працуе да 2 мая.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**



*«Рытуал».*